Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за жнівень 2013 г.

## Мерапрыемствы ў рамках конкурсу «Лета і кніга»

**3 жніўня**

Казачнае прадстаўленне "Запрашаем у казку-град мы дзяўчат і хлапчанят"
У праграме:
-конкурс малюнка "Мой любимый герой"
-падвядзенне вынікаў конкурсу "Лета і кніга".
-выступленне лялечнага гуртка з казкай "Таямнічныя зоркі"

(Дзівінская дзіцячая бібліятэка, 37 чал)

**10 жніўня** Свята кнігі і чытання "Пусть нас объединяет книга". Бібліятэка ўшаноўвала сваіх лепшых чытачоў у васьмі намінацыях дыпломамі і падарункамі. Пераможца ў намінацыі "Любитель поэтического слова" Беразюк Н.С. чытаў свае вершы, якія неаднаразова друкаваліся на старонках газеты "Кобрынскі веснік". На працягу свята гучалі песні у выкананні самадзейных артыстаў Восаўскага СДК.

(Восаўская СБ, 80 чал.)

**11 жніўня**

Завочнае падарожжа па кнізе В.Гардзея "Малая дзіцячая Чырвоная кніга"
Вандруя па кнізе, прысутныя зрабілі тры прыпынкі:
1 Расліны, 2. Птушкі, 3. Жывелы.
Дзеці чыталі вершы В.Гардзея "Кветкі роднай зямлі", знаходзілі адказы на загадкі, прынялі ўдзел ў дыскусіі "А што мы можам зрабіць, каб зберагчы расліны"

(Гарадзецкая СБ, 40 чал.)

**14 жніўня**

Конкурс водгукаў аб прачытанай кнізе "Мая любімая кніга гэтага лета". Дзеці прадставілі анатацыі на любімыя кнігі з прыгожа аформленымі вокладкамі. Тэкст дапаўнялі малюнкамі любімых герояў. У бібліятэку дзеці прадставілі 17 водгукаў, якія былі прадстаўлены на выставе. Прызы за лепшае афармленне атрымалі: Асіпук Іра, Дземчык Насця, Краўчук Віка.

(Арэхаўская СБ, 17 чал.)

**25 жніўня**

Урок творчасці «Где бывал, что видел – на бумаге рисовал» прайшоў у бібліятэцы пад адкрытым небам. Да мерапрыемства падрыхтавана кніжная выстава-фуршэт «С книгой весело шагать». На ўроку дзеці ляпілі з пластыліну сваіх любімых герояў, нехта маляваў іх на паперы. Прысутныя мелі магчымасць паўдзельнічаць у конкурсах і віктарынах, знаўцы шахмат і шашак правялі міні-матчы, а пераможцаў чакалі падарункі.

(Астроміцкая СБ, пляцоўка каля бібліятэкі, 70 чал)

**31 жніўня**

Прайшла акцыя пад адкрытым небам «Читать – это модно! Читать – это мудро». У рамках акцыі быў арганізаваны адкрыты прагляд літаратуры для дзяцей «Пусть телевизор подождет, книгу в руки и вперёд!», афармлена кніжная выстава «Вы спрашиваете – книги отвечают» . Бібліятэку пад адкрытым небам наведаў старшыня СПК В.І. Кацюбка. Пасля святочнай рэгістрацыі шлюбу ў акцыі прынялі ўдзел маладажоны.

(Навасёлкаўская СБ, каля 90 чал.)

## Мерапрыемствы ў рамках бібліяэстафеты “Чытаючыя вёскі”

**2 жніўня**

У рамках свята вёскі «Родимый край, село родное» Бельская СБ правяла літаратурна-музыкальную кампазіцыю «О хлебе, о людях, о крае родном». На мерапрыемстве была прадстаўлена выстава народнай творчасці «Рукам работа – сэрцу радасць». У вершаванай форме гучалі словы падзякі лепшым чытачам вёскі, якія былі ўзнагароджаны дыпломамі і падарункамі.

(Бельская СБ, 170 чал.)

**18 жніўня**

Свята духоўнай кнігі «Август пахнет яблоками» прайшло ў Гайкоўскай бібліятэцы і было прысвечана Яблачнаму Спасу. На мерапрыемстве прысутнічаў свяшчэннік Свята-Мікалаеўскай царквы в. Верхалессе пратаіерэй Валерый Заруба, які пазнаёміў прысутных з гісторыяй свята, а пасля мерапрыемства асвяціў яблыкі.
У праграме мерапрыемства:
-тэатралізаванае прадстаўленне паводле казкі В.Суцеява «Яблоко»;
-выступленне героя кніг М.Носава дохтара Пілюлькіна аб карысці яблык;
-ушанаванне лепшых чытачоў бібліятэкі ў дзесяці намінацыях;
-гульні і конкурсы;
-музыкальнае віншаванне ад самадзейных артыстаў Хідрынскага ДК.

(Гайкоўская СБ, 130 чал.)

## Іншыя мерапрыемствы

**4 жніўня**

Гадзіна прафарыентацыі «Зову в профессию свою». Прысутныя пазнаёміліся з тэматычнай папкай «Радуга профессий». Перад прысутнымі выступілі: настаўніца Тэвельской школы Шэлест Л.Г., фельчар-акушэр Палеецык В.У., акампаніятар Стрыгаўскага ДК Марчук А.М.

(Тэвельская СБ, 37 чал.)

**8 жніўня**

Фотападарожжа па вуліцах вескі Залессе “Райскія куточкі аднавяскоўцаў”. З фотаздымкаў арганізавана фотавыстава лепшых падвор’яў жыхароў вёскі. У фотападарожжы прынялі ўдзел 14 “фотакарэспандэнтаў”. На фотавыставе прадстаўлена 25 фотаздымкаў.

(Залеская СБ, 41 чал.)

**10 жніўня**

Дзень садавода-агародніка “Поделимся секретами”. Кветкавод вёскі Н.В. Стэфанюк, садавод У.А.Грамічук і В.Байдук, у якога ў двары расце больш 30 відаў лекавых раслін. Гаспадары падзяліліся з прысутнымі сваімі сакрэтамі.

(Навасёлкаўская СБ, 27 чал.)

**16 жніўня**

У рамках Года беражлівасці Повіцьеўская дзіцячая бібліятэка правяла ўрок беражлівасці «Бизнес кота Матроскина», які прайшоў у школьным лагеры в. Павіцце. Дзякуюч тэатралізаванму прадстаўленню, дзеці вучыліся эканоміі і беражлівасці ў “цэнтры дзіцячага прадпрамальніцтва “Матроскін і К””

(Повіцьеўская дзіцячая бібліятэка 57 чал.)

**18 жніўня**

Конкурс хатніх загатовак «Смачна есці». Жанчыны падзяліліся рэцэптамі сваіх страў з маладымі чытачамі бібліятэкі. Прысутныя мелі магчымасць прадэ-

густаваць гэтыя стравы. Бібліятэкар прадставіла міні-агляд выданняў па кулінарыі «Смачны Вітамінчык».

(Дзівінская СБ, 28 чал.)

**18 жніўня**

Дзень культуры на вытворчым участку «Падарунак роднай зямлі – яго вялікасць Хлеб».

У праграме:

- выступлене ЛПГ: гучалі вершы і песні, прысвечаныя хлебаробам, жніву і хлебу;
-разам з работнікамі Лукскага СДК віншавалі перадавікоў жніва – экіпаж камбай-нёраў Гарудка В.П., Кацена М.А. У іх гонар прагучалі музычныя віншаванні.

(Лукская СБ 31 чал, на жніўным полі)

**19 жніўня**

Прайшоў відэапрактыкум для бібліятэкараў раёна «Учимся, развиваемся, создаём». Да мерапрыемства быў падрыхтаваны відэаагляд «Изучаем профессиональные издания». Прайшоў відэаналіз мерапрыемстваў, якія прайшлі ў рамках раённай бібліяэстафеты "Чытаючыя вёскі". Бібліятэкары абменьваліся вопытам па правядзенню вялікіх масавых мерапрыемстваў для усіх катыгорый насельніцтва.

(Цэнтральная бібліятэка, 64 чал.)

**22 жніўня**

Дзень інфармацыі «Библиотека и образование – единое социокультурное пространство» праведзены для настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры раёна.

На мерапрыемстве цэнтральная бібліятэка прадставіла:

- рэкламную выставу «В портфолио современной школы»;
- інфармацыйны агляд «Библиотека в помощь учебному процессу »;
- агляд краязнаўчых дапаможнікаў "Літаратурная Кобрыншчына", выданых у цэнтральнай бібліятэцы.

(Цэнтральная бібліятэка 70 чал.)

Гал. бібліятэкар АБМ Іванова І.
2-36-81